УДК 741+378.147.025.7

# Дыялог «настаўнік-вучань» як працэс пазнання

Барбарчык М.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У аснове ўзаемаадносін выкладчыка і студэнта ляжыць вучэбны працэс – складаная еднасць дзейнасці выкладчыкаў і навучэнцаў, якая накіравана на ўзбраенне будучых спецыялістаў неабходнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, на авалодванне прафесіяй. Арганізацыя вучэбнага працэсу прадыктавана патрабаваннем пазнання і навучання з дапамогай дыялога. Дыялог у нашым выпадку – гэта не проста размова дзвюх асоб, а ўзаемадзеянне двух суб’ектаў вучебнага працэсу на працягу навучання.

Вынікам дыялога з’яўляецца супярэчлівы працэс пастаяннага руху і развіцця. Супярэчнасць у навучанні ўяўляецца намі як аб’ектыўны факт і выражаецца паміж асабістым вопытам студэнта і навуковымі ведамі, паміж неабходнасцю і магчымасцю рашаць пазнавальныя задачы. Адной з задач працэсу навучання з’яўляецца выпрацоўка ўменняў, якая адбываецца двума шляхамі. Першы – калі студэнты самастойна выпрацоўваюць прыёмы дзейнасці. Гэта цяжкі шлях «проб і памылак». Другі шлях – шлях дыялога, калі адбываецца засваенне зададзенага алгарытма, дзе вучням паведамляюцца прыкметы, па якіх магчыма рашаць акрэслены тып задач.

Менавіта дыялог, а не маналог садзейнічае паскарэнню эфектыўнасці адукацыйных працэсаў. Маналог выкладчыка як пачатковы акт навучання (у форме лекцый, практычных прыкладаў і да т.п.) неабходны. Але практычны вопыт сістэмы адукацыі даказвае, што без актыўнай дзейнасці ўнікнуць у сутнасць вучэбнай інфармацыі, яе крытычна асэнсоўваць адукацыйны вынік будзе нізкім.

Працэс зносін адыгрывае важную ролю ў фарміраванні асобы спецыяліста. Гэта звязана ў першую чаргу з развіцём мыслення: у выніку мыслення складваюцца паняцці, якія ўзнікаюць, існуюць і выражаюцца ў слове. Слова ж фактычна з’яўляецца інструментам пазнавальнага дыялога. Слова выкладчыка – гэта інструмент, з дапамогай якога адбываецца ўплыў на душу студэнта, яго разумовае выхаванне. Майстэрства выхавання ўключае ў сябе здольнасць весці размову, звяртаючыся да студэнцкай аўдыторыі. Словам можна даць параду, усяліць веру ці, наадварот, пасеяць недавер і няўпэўненасць у сваіх сілах. Важным выхаваўчым аспектам дыялога з’яўляецца прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, паколькі яны з’яўляцца асновай маральнай свядомасці асобы.